СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ ЗАХОПНІКАМ!

Прачытаў—перадай другому

# ЗА РАДЗІМУ

Орган Магілеўскага падпольнага абкома КП(б)Б

№ 6 (44) | Панядзелак 1 Мая | 1944 г.

**ПАРТЫЗАНЫ І ПАРТЫЗАНКІ! У ДЗЕНЬ 1-га МАЯ ПАКЛЯНЁМСЯ АДПОМСЦІЦЬ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМ ЛЮДАЕДАМ ЗА КРОЎ І СЛЁЗЫ НАШЫХ БАЦЬКОЎ І ДЗЯЦЕЙ, ЗА РАЗБУРАНЫЯ І СПАЛЕНЫЯ ГАРАДЫ І ВЁСКІ!**

## НЯХАЙ ЖЫВЕ ПЕРШАЕ МАЯ—ДЗЕНЬ АГЛЯДУ БАЯВЫХ СІЛ ПРАЦОЎНЫХ!

## Блізка дзень перамогі

Сёння Першае Мая. Трэці раз народы нашай Радзімы сустракаюць гэта свята ў суровай абстаноўцы вялікай Айчыннай вайны супроць гітлераўскіх захопнікаў. Трэці раз сустракае гэта свята ў абстаноўцы крывавага фашысцкага тэрора насельніцтва часова акупіраваных гітлераўцамі абласцей і раёнаў.

Фашысцкія шакалы прымянілі ўсю сваю звярыную вынаходлівасць у знішчэнні і катаванні нашага народа. Толькі фашысты здольны забіваць аб брук дзяцей, кідаць іх у агонь, пракалваць штыком разам маці і грудное дзіця, атручваць у машынах-душагубках жанчын і дзяцей.

Гераічная Чырвоная Армія гоніць на захад гітлераўскіх катаў. Ужо вызвалена амаль уся савецкая Украіна, Крым, частка савецкай Беларусі. Чырвоная Армія звярнула Радзіме данбаскі вугаль, крыварожскую руду, украінскую пшаніцу, вызваліла ад акупантаў дзесяткі мільёнаў савецкіх людзей.

У вызваленыя раёны на 1 студзеня 1944 года завезена 16.481 трактар, 8.409 плугоў, 1.216.182 галавы рагатай жывёлы, звыш 500 тысяч дамашняй птушкі.

Адчувальныя ўдары па ворагу з тылу наносяць нашы адважныя партызаны і партызанкі. Толькі па нашай вобласці партызаны знішчылі звыш 120.000 гітлераўцаў, 1.463 эшалоны ворага.

Ужо блізка час перамогі!

З усходу чуцен гром кананады. Гэта ідзе Чырвоная Армія—армія вызваліцельніца, ідзе свяшчэнная помста фашысцкім захопнікам!

Партызаны і партызанкі! Набліжайце дзень перамогі. Мацней удары па варожых тылах. Не прапусцім к фронту ні аднаго эшалона ворага!

Няхай жыве 1-е мая—баявы агляд сіл працоўных!

Няхай жыве свабодная савецкая Беларусь!

Слава Вялікаму Сталіну!

### ПАРТЫЗАНЫ МАГІЛЕЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ ЗНІШЧЫЛІ



Гітлераўцаў
123.180



Эшалонаў
1.463



Гарнізонаў
469



Мастоў
1.428



Рэльс
23.057

С. МАРШАК.

## Первое Мая 1944 года

Зимних туч рассеялась завеса,
Озарен весной советский край.
Симферополь, Киев и Одесса
Вместе с нами встретят ПЕРВОМАЙ.

Обменяются приветом братским
Николаев, Ялта, Ленинград.
В этот день по зданьям ленинградским
Не ударит пушечный снаряд.

Оглядим мы зорько, по-хозяйски
То, что, уходя, разрушил враг.
„Все вернем!"—гремит нам первомайский,
На ветру колеблющийся флаг.

Верим мы, что будет триумфален
Этот праздник в будущем году.
Свой родной народ товарищ Сталин
Призовет к счастливому труду.

А сегодня на переднем крае
Встретим утро яростным огнем,
Чтобы стал наш праздник Первомая
Тысячам врагов последним днем!

жр 3230



## БАЯВЫМІ СПРАВАМІ АДКАЗВАЮЦЬ ПАРТЫЗАНЫ НА ЗВАРОТ БЕЛАРУСКАГА ЎРАДА І ПІСЬМО ОБКОМА КП(б)Б

### Адказваем справамі

Зварот СНК БССР, Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР і ЦК КП(б)Б знайшоў гарачы водгук сярод партызан Клічаўскага раёна. Канкрэтнымі баявымі справамі адказваюць народныя мсціўцы на зварот.

За апошні час атрады раёна разграмілі гарнізоны ворага ў П. С. і М. і моцны апорны пункт у мястэчку П. Падрыўнікі спусцілі пад аткос 6 воінскіх эшалонаў.

К—р злучэння Ігнат.

### Разграмілі зборны пункт

На зборны пункт каля вёскі Колбава фашысты сагналі насельніцтва для адпраўкі ў лагер смерці. Гэта стала вядома партызанам Н-скага атрада.

Група партызан пад камандаваннем тав. М—ка напала на зборны пункт. Знішчыўшы ахрану, партызаны вызвалілі 150 чалавек насельніцтва.

У гэтым баі адзначыліся партызаны Ж—ў, З—ч, Б—ц і др.

В.

### Абараняем насельніцтва

Група немцаў пад'яжала к вёсцы Касцюковічы з задачай забраць насельніцтва. На подступах к вёсцы іх сустрэлі партызаны нашага атрада.

Бой цягнуўся некалькі гадзін і ў выніку боя фрыцы адышлі, пакінуўшы на полі бою 23 забітых.

Мэты вораг не дасягнуў. Партызаны абаранілі насельніцтва.

Філіп Н.

### Знішчана 8 машын

Група партызан пад камандаваннем тав. К—ва зрабіла засаду на шасе Магілеў—Мінск.

Хутка паказалася калона аўтамашын. У выніку кароткага боя знішчана 7 грузавых і 1 легкавая машына. Забіта 40 і паранена 15 гітлераўцаў.

Зараз усе атрады раёна актывізіравалі баявыя дзеянні.

Б—ў.

### Не даём ворагу спакою

Нядрэнна папрацавалі атрады нашага раёна за прайшоўшы месяц.

Атрады правялі 8 баёў, спусцілі пад адкос 7 варожых эшалонаў, падбілі 10 аўтамашын.

У баях і ў эшалонах знішчана звыш 940 і паранена 193 гітлераўцы.

С—наў.

### Паймалі фрыца

Партызанка Н-скага атрада Ольга Р. сустрэла ў вёсцы З. немца. Завёўшы яго ў хату, Ольга паведаміла партызанам Пятру М. і Васілю М.

Падаспеўшыя хлопцы абяззброілі фрыца і даставілі ў штаб.

С—д.

### Мініруем шляхі

У адным з баёў партызаны Н-скага палка захвацілі, у ліку іншых трафей, міну ў 60 кілаграмаў.

Днямі партызаны паставілі гэту міну на шляху Гарадзец—Ахоцічы. На міну наскочыла 10-тонная аўтамашына на гусенічным ходу.

Выбух быў такой сілы, што ад машыны і ехаўшых у ёй немцаў засталіся як кажуць рожкі ды ножкі. 35 гітлераўцаў загінулі ад сваёй нямецкай міны, 15 фрыцаў атрымалі раненні.

Не дадзім праклятым гітлераўцам ні праехаць ні прайсці па нашых дарогах.

Б—кі.

### Масіраваны налёт на Львоў

У ноч на 28 красавіка наша авіяцыя дальняга дзеяння зрабіла масіраваны налёт на чыгуначны вузел Львоў і бамбардыравала скапленні воінскіх эшалонаў ворага. Узніклі пажары і моцныя ўзрывы.

### БАМБАРДЫРОЎКА АЭРАДРОМА ПРАЦІЎНІКА Ў г. ОРШЫ

У ноч на 28 красавіка наша авіяцыя бамбардыравала аэрадром праціўніка ў раёне гор. Орша. На аэрадроме знаходзілася многа самалётаў.

У выніку бамбардыроўкі ўзнікла 15 буйных ачагоў пажараў. Гарэлі самалёты, склады гаручага і боепрыпасаў. Адбылося некалькі моцных узрываў.

## ЗА ГРАНІЦАЙ

### Дзеянні авіяцыі саюзнікаў

ЛОНДАН, 25 красавіка. У ноч на 25 красавіка вельмі буйныя злучэнні англійскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на Карлсруэ і Мюнхен (Германія). Акрамя таго бамбардыроўцы падвергнута чыгуначнае дэпо Шамблі каля Парыжа.

ЛОНДАН, 28 красавіка. Учора буйныя злучэнні цяжкіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на ваенныя аб'екты Паўночнай Францыі. Праціўнік аказаў слабае супраціўленне.

У ноч на 28 красавіка вельмі буйныя злучэнні бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на чыгуначныя аб'екты ў Монцэне (Бельгія) і Ольнуа (Францыя). Самалёты „Москито" бамбардыравалі горад Штутгарт.

### ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

26 і 27 красавіка англійская авіяцыя зрабіла налёт на японскія судны каля ўзбярэжжа Бірмы. Знішчана 34 японскіх судны і многа барж.

* * *

У Будапешце зроблен замах на венгерскага міністра юстыцыі Іштлан—Антала. Апошні цяжка паранен.

В. а. адказнага рэдактара І. КРЫСКАВЕЦ.

Друкарня газеты „За радзіму".